паэзія

Леанід Дранько-Майсюк



...Жыла між царквой і касьцёлам,
Мячэцьцю і сінагогай...

# Краўчыха Антоніха

*Ты расказала і пра Антоніху –*
*Сваю прабабку,*
*Што жыла ў заходнебеларускім*
*мястэчку*
*І памерла яшчэ пры Масьціцкім.*
*Яна так і ня зьведала каханьня —*
*Яе ж Антоні ўсё трызьніў*
*аб нейкай там Ганьне!*
*Калі праўду сказаць,*
*То Антоніха пра каханьне й ня думала:*
*Шыючы людзям, марыла пра багацьце,*
*Аднак мара ня спраўдзілася…*

Антоніха, быццам жабрачка,
З душою па-звыкламу гожай.
Ніхто не казаў, што лайдачка,

Аднак жа гібела бяз грошай.
Антоні ж, скрыпач безграшовы,
Пянёндзы раскідваў па лёсе
І толькі што ў дзень кірмашовы
Ён злота якога прыносіў...

Бяз крыку яна і бяз енку
Марнела ў чаканьні багацьця…
Як новую справіць сукенку,
Ня мела, як кажуць, паняцьця.

Затое глядзела на зоры,
Затое на кветкі глядзела;
Ніколі ня плакала ў горы
І ў шчасьці, бо шчасьця ня мела.

Усіх сустракала вясёла;
Адзінага славіла Бога;
Жыла між царквой і касьцёлам,
Мячэцьцю і сінагогай.

Бывала, ледзь бачнай сьлязінкай
Душу асьвятляла і слова,
Ды музыкай швейнаю «зінгер»
Яе суцяшаў адмыслова.

Калі ж цеплыні нsettled ставала,
Тады, імкнучыся да ладу,
То дзецьмі сабе разважала,
То песенькай хатняга складу:

«Сукенка Ганулі,
Спадніца Настулі,
Кашуля Антолі,
Ясёнка Аўдолі...
Штаны Апанасу,
Камзэля Тарасу,
А беднай краўчысе
Зацірка – у місе...»

А ў часе гаворкі гарачай
Прасіла: «Ша, дай жа мне сп*о*кой!»
Спакой уяўляла, няйначай,
Іконаю, самай высокай.